ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

# ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАЕЦЦА З КРАСАВІКА 1955 ГОДА ● ● № 22 (3634) ● ● ПЯТНІЦА, 27 ЛІСТАПАДА, 2020

ВЫДАННЕ “ГОЛАС РАДЗІМЫ” ЧЫТАЙЦЕ Ў ІНТЭРНЭЦЕ НА ПАРТАЛЕ ZVIAZDA.BY



Даніна любові Уладзіміру Караткевічу

Стар. 3



Родныя твары ў Новасібірску

Стар. 4-5



Добрасуседства як каштоўнасць

Стар.8

ПЕРСПЕКТЫВЫ

## Ствараем машыны — будуем сябе

**На пытанне пра перспектывы машынабудаўнічай галіны, якое прагучала ў часе наведвання Прэзідэнтам Беларусі прадпрыемства “Гомсельмаш”, Аляксандр Лукашэнка заявіў адназначна: “Машынабудаванню ў Беларусі быць!”**

Як уплывае развіццё машынабудавання ў краіне на ўмацаванне творчага, інтэлектуальнага патэнцыялу ўсяго народа? І без навуковых выкладак відавочна: вельмі станоўча. І калі ў часе наведвання “Гомсельмаша” на сустрэчы з працоўным калектывам у Прэзідэнта запыталі пра перспектывы машынабудаўнічай галіны ў краіны, ён разважаў так: “Гэта аснова. Для мяне, як Прэзідэнта, гэта аснова: зберагчы машынабудаванне. Для чаго? Не для таго, каб вырабляць гэтыя жалязякі, не ў тым галоўнае. А галоўнае — у нас будуць інжынеры. У нас будуць канструктары, кіраўнікі”.



На палетках — беларускія камбайны

Ёсць выслоўе: мы робім працу, а праца робіць нас. Бо ў працы мы набываем, удасканальваем нейкія навыкі. І чым больш яна складаная, то ўсё больш развіваюцца інтуіцыя, інтэлект. Назапашваецца досвед існавання ў соцыуме, разуменне свайго месца ў ім, глыбей спасцігаюцца ягоныя законы — пісаныя й няпісаныя. Да таго ж на сучасных вытворчасцях, пры “разумных” станках, рабатызаваных комплексах патрэбныя адпаведныя спецыялісты, пажадана з вышэйшай інжынернай адукацыяй. І як універсітэт у горадзе, вобразна кажучы, пралівае святло ведаў на ўсіх гараджан, стварае пэўную культурную атмасферу, так і сучасная вытворчасць дадае ў наваколле ды ў “архітэктуру” краіны (калі вытворчасць знакавая) важныя элементы. І не выпадкова, дарэчы, старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь Салавей дакладваў Кіраўніку дзяржавы пра вытворча-эканамічнае й сацыяльнае развіццё ўсяго рэгіёну. І пра стан спраў на заводзе ішла размова: з імі знаёміў кіраўнік прадпрыемства Аляксандр Новікаў.




Аляксандр Лукашэнка наведвае прадпрыемства “Гомсельмаш”

Працягваючы развагі пра важнасць “інжынернай праслойкі” ў грамадстве, Прэзідэнт прызнаўся: “Калі я прызначаю на пасаду людзей, гляджу біяграфію чалавека, калі ў яго ёсць армія й рабочая закваска, ды яшчэ калі ён інжынерам недзе папрацаваў — зялёная вуліца. Вось галоўнае: мы мазгі зберагаем, людзей. Таму гэта вельмі важна”. І досвед станаўлення “Гомсельмаша” — важкая прычына, каб развіваць машынабудаўнічую галіну. Аляксандр Лукашэнка згадаў, як у сярэдзіне 90-х у Беларусі не было тэхнікі, каб убраць збожжа: камбайны з часоў СССР на той час знасіліся. “І вось тады было галоўнае пытанне: што рабіць з “Гомсельмашам”,— успомніў Прэзідэнт.— Ці будзем вырабляць мы свае кормаўборачныя й зерняўборачныя камбайны? А тады ж толькі два тыпы й выраблялі”. Былі, вядома ж, аргументы супраць будаўніцтва свайго камбайна, прапаноўвалася закупіць такую тэхніку ў Германіі: “Я гавару: а за што купім? Для таго, каб купіць дарагія камбайны ў Германіі маркі CLAAS ці John Deere амерыканскія, вялізныя грошы патрэбныя. І тады мы прынялі рашэнне: будзем рабіць свой камбайн”,— расказаў Прэзідэнт.

Вось такі, комплексны падыход пры рашэнні дзяржаўных праблем — эканамічных, сацыяльных, культурных — і дае ў выніку добры плён. Аляксандр Лукашэнка, згадаўшы мінулае, прадоўжыў: “Калі вы ў мяне пытаецеся, якая перспектыва — ды я ніколі ў жыцці не пайду на тое, каб загубіць тое, што рабіў, у тым ліку і ўласнымі рукамі. Таму машынабудаванню ў Беларусі — быць”!

**Іван Ждановіч**

**Даведка ГР.** Больш за 65 працэнтаў прадукцыі “Гомсельмаша” ідзе на экспарт. У таваправоднай сетцы прадпрыемства — звыш 130 суб’ектаў па розных краінах.

НА ПАМЕЖЖЫ КУЛЬТУР

## Латыш з беларускім кодам у крыві

**У Даўгаўпілскім Цэнтры беларускай культуры створаны невялікі дакументальны фільм “Райніс і Даўгаўпілс” на беларускай мове. Ён расказвае пра моцныя повязі Яніса Райніса, Даўгаўпілса й беларусаў. Фільм дэманстраваўся ў часе вебінару, які зладзілі ЦБК сумесна з кафедрай літаратуры Віцебскага дзяржуніверсітэта імя Пятра Машэрава.**

### Ён падабраў імя на бальшаку

Фільм задуманы так, што глядач здзяйсняе экскурсію па месцах, спалучаных з імем вядомага паэта й палітыка, які ў свой час у латышскім Сэйме адстойваў інтарэсы беларускай дыяспары Латвіі ды ўвайшоў у гісторыю як абаронца нацыянальных меншасцяў.

Аўтар ідэі, тэксту — Жанна Раманоўская, відэаздымкі й мантаж здзейсніў Аляксандр Фядотаў, ёсць і музычнае суправаджэнне: беларускія народныя песні ў выкананні Вячаслава Пятрова.

Даўгаўпілс — другі па велічыні горад Латвіі, на абодвух берагах Даўгавы-Дзвіны, кіламетрах у 25-і ад мяжы з Беларуссю. Спускаешся з горкі па шашы, з боку Браслава,— і бачыш горад, цесна звязаны з імем Яніса Райніса. На тым, левым беразе, непадалёк ад горада, былі маёнткі з землямі, якія ў розны час арандаваў латышскі селянін Крыш’яніс Пліекшанс, бацька будучага паэта, драматурга, перакладчыка, палітыка й грамадскага дзеяча.

У мястэчку Беркенэле прайшлі дзяцінства й ранняе юнацтва Яніса. Там узрастаў ён, і першыя вершы напісаў. Сядзіба зберагалася: у ёй шмат гадоў дзейнічае Дом-музей Райніса, гэта помнік нацыянальнага значэння. У Беркенэле Яніс захапіўся чытаннем: знайшоў на гарышчы кучу старых кніг. Першым настаўнікам ягоным быў нямецкі пастар Свенсан, затым хлопчык вучыўся ў Грыўскай нямецкай школе — цяпер там Даўгаўпілская СШ № 6 імя Я. Райніса. Паэт успамінаў, што першыя вершы напісаў на латышскай мове ў школе, пазней пісаў і на нямецкай ды латыні. Але менавіта мама, Дарта Пліекшанэ, першай далучыла Яніса да народнай паэзіі: яна ведала вялікае мноства народных песень. → Стар. 6



Яніс Райніс. Менск, 19 лістапада 1926 г.

ISSN 0439-3619

9 770439 361003 20022

ПРЫЯРЫТЭТЫ

# З дзяцей вырастае будучыня

20 лістапада ў свеце адзначаўся Сусветны дзень дзяцей. На прэс-канферэнцыях у Доме прэсы з гэтай нагоды гаварылі пра абарону правоў дзіцяці ў нашай краіне, пра дзяржаўную падтрымку адоранай і таленавітай моладзі.

20 лістапада ў 1959 годзе была прынятая Дэкларацыя правоў дзіцяці, а ў 1989-м — адпаведная Канвенцыя, што стала першым і асноўным міжнародна-прававым дакументам, у адпаведнасці з якім правы дзіцяці пачалі разглядацца на ўзроўні міжнароднага права. У 1990-м Беларусь далучылася да Канвенцыі. У 1993-м у краіне быў прыняты закон “Аб правах дзіцяці”, а ў 1996-м створана Нацыянальная камісія па правах дзіцяці.

Адно з правоў дзіцяці — права на адукацыю. У Беларусі вядзецца сістэмная праца па выяўленні талентаў, пачынаючы з малалецтва. Гэта робіцца для таго, каб дзеці маглі развівацца, а ў будучыні атрымалі прафесію, сталі спецыялістамі высокага класа.

Праявіць сябе ім дапамагае Спецыяльны фонд Прэзідэнта Беларусі па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў. Лаўрэатамі фонда ўжо сталі 1230 маладых людзей, якія перамаглі ў міжнародных інтэлектуальных спаборніцтвах, з іх 402 студэнты й 828 навучэнцаў.

За час дзейнасці Спецыяльнага фонда Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы таленавітай моладзі заахвочванні атрымалі 4254 чалавекі ды 319 калектываў. Найвышэйшая ўзнагарода, гранд-прэмія, была прысуджана 417 суіскальнікам і 57 калектывам. Акрамя заахвочвальных прэмій, стыпендый за перамогі ў конкурсах даюцца й гранты. “Гэта — цікавая форма атрымання сродкаў на рэалізацыю творчых ідэй. На мой погляд, за грантамі будучыня, таму што гэта спосаб, які дае магчымасць чалавеку ў поўнай меры раскрыцца, — расказала рэктар Беларускай дзяржакадэміі музыкі, старшыня савета Спецыяльнага фонда Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы таленавітай моладзі Кацярына Дулава. — Акрамя таго, і падтрымка вялікіх праектаў. Так, за кошт грантаў Спецфонда Прэзідэнта рэалізоўваліся маштабныя праекты, скіраваныя на рэалізацыю творчых моладзевых ініцыятыў. Сярод іх — “Талент краіны”, “Дакрананне”, “Музычная спадчына Радзімы”.

SB.BY



Дзеці маюць права на адукацыю



Каманда, якую падрыхтаваў Аляксандр Францкевіч, у 2019 годзе на конкурсе па робататэхніцы ў Дубаі была прызнана лепшай сярод 189 краін свету. На фотаздымку: настаўнік з вучнямі.

З 2010 года ў Беларусі вядуцца й выкарыстоўваюцца банкі дадзеных адораных і таленавітых юнакоў і дзяўчат. Туды ўключаюцца звесткі пра грамадзян Беларусі, замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія пастаянна жывуць на тэрыторыі нашай краіны, ва ўзросце да 31 года. У **Банк дадзеных адоранай моладзі** занесены тыя, каму прысуджаны заахвочванні Спецфонда Прэзідэнта па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў. А гэта — пераможцы (I, II, III месца, дыпломы I, II, III ступені, залаты, сярэбраны, бронзавы медаль) міжнародных і рэспубліканскіх алімпіяд (конкурсаў, турніраў...). Яны маюць асаблівыя поспехі ў навукова-тэхнічнай творчасці, навукова-даследчай і вынаходніцкай дзейнасці. Сярод іх ёсць кіраўнікі, чальцы кіруючых органаў моладзевых і дзіцячых грамадскіх аб’яднанняў, якія карыстаюцца дзяржпадтрымкай. У **Банк дадзеных таленавітай моладзі** ўключаюцца тыя, каму прысуджаны заахвочванні Спецфонда Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы таленавітай моладзі. Гэта звычайна пераможцы (Гран-пры, I, II, III месца, дыпломы I, II, III ступені) міжнародных і рэспубліканскіх мастацка-творчых імпрэзаў, тэле- і радыёпраектаў.

У першым паўгоддзі 2020 года ў Банк дадзеных адоранай моладзі дадалася інфармацыя пра 639 грамадзян, цяпер іх — 6180. А ў архіў занесены звесткі пра 16168 адораных.

У Банку дадзеных таленавітай моладзі — звесткі пра 672 грамадзян і 233 калектывы, у архіве банка — звесткі пра 2263 таленавітых людзей.

Важна, што юнакі й дзяўчаты з Банка дадзеных адоранай і таленавітай моладзі маюць права на пазачарговае атрыманне жылога памяшкання ў інтэрнаце ў перыяд навучання, на першачарговае размеркаванне пасля заканчэння ВНУ. Калі ж такі выпускнік становіцца маладым спецыялістам, ён мае права на надбаўку да тарыфнай стаўкі, аклада. У адораных і таленавітых маладых людзей таксама ёсць права на атрыманне ільготнага крэдыту на будаўніцтва, рэканструкцыю ці набыццё жылля. Апошнім часам у Беларусі збіраюцца ўвесці новыя ільготы для адоранай моладзі пры паступленні ў ВНУ. На прэс-канферэнцыі начальніца ўпраўлення прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Мінадукацыі Аляксандра Пятрова расказала, што ў правілы паступлення плануецца ўнесці пункт пра алімпіяды ўнутры ВНУ, пераможцы якіх будуць на ільготных умовах паступаць ва ўстановы вышэйшай адукацыі. Мінадукацыі праводзіць штогадовы конкурс і на атрыманне грантаў для выканання навукова-даследчых работ. Такая падтрымка скіраваная на стварэнне дадатковых умоў для стымулявання таленавітых навукоўцаў. Ну і, вядома, важны элемент сістэмы падтрымкі — Спецыяльны фонд Прэзідэнта Беларусі па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў.

Дзяржава аказвае падтрымку й таленавітым школьнікам. Як расказала галоўны спецыяліст упраўлення агульнай сярэдняй адукацыі Мінадукацыі Наталля Іванова, уся сістэма конкурсаў, якая існуе на школьным узроўні, дае магчымасць заўважыць асаблівасць, гатоўнасць да працы, зацікаўленасць у вывучэнні таго ці іншага прадмета ў дзяцей.

Прадстаўнікі Мінадукацыі распавялі аб стварэнні Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарка: ён будуецца ў Першамайскім раёне сталіцы, бліжэй да МКАД, паміж 15-м корпусам БНТУ й жылым комплексам “Магістр” (па вуліцы Францыска Скарыны) і ўключае ў сябе тры аб’екты: вучэбна-лабараторны корпус, інтэрнат і школу. Комплекс ствараецца ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта. Пры навучанні адораных дзяцей там будуць выкарыстоўваць так званы міждысцыплінарны падыход — па прыкладзе расійскага адукацыйнага цэнтра “Сириус” у Сочы. Дзіцячы тэхнапарк у Беларусі будзе рэалізоўваць новую праграму дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі па аэракасмічных тэхналогіях, інфармацыйных і камп’ютарных тэхналогіях, лазернай тэхніцы й тэхналогіях, біятэхналогіях, робататэхніцы, “зялёнай” хіміі, нанатэхналогіях, энергетыцы, машынах і рухавіках, інжынернай экалогіі, архітэктурным і прамысловым дызайне. Адораныя дзеці змогуць займацца й навуковымі даследаваннямі. Акрамя таго, у дзіцячым тэхнапарку будуць ладзіцца кароткатэрміновыя азнаямленчыя праграмы, у тым ліку для дзяцей з рэгіёнаў. Праграма для адораных дзяцей арыентаваная на вучняў 6-11 класаў, і ўжо ў студзені 2021-га ў эксперыментальным рэжыме пачнуць працу тры групы.

**Ганна Лагун**

СА СТУЖКІ НАВІН

## Лясных пабольшала дарог

Што такое дарогі — тлумачыць не трэба. Цяпер, калі ўсё больш актыўна ў Беларусі асвойваюцца багатыя лясныя рэсурсы, то й лясныя дарогі становяцца важным складнікам для гаспадарання — эфектыўнага, разумнага, экалагічна чыстага.

На сайце БелТА з’явілася паведамленне: лесагаспадарчыя ўстановы Беларусі датэрмінова выканалі даручэнне Прэзідэнта па будаўніцтве лесагаспадарчых дарог. У краіне на 20 лістапада ўведзены ў эксплуатацыю 18 новых аб’ектаў агульнай працягласцю 103,9 км — пра тое калегам паведамілі ў прэс-службе Мінлясгаса. Найбольшая колькасць аб’ектаў (шэсць) з’явілася на Віцебшчыне: гэта Верхнядзвінскі, Віцебскі, Дзісненскі, Лёзненскі, Вушацкі ды Шумілінскі лясгасы. Вынік: у лясах вобласці пабудавана больш за 27 км новых дарог. У Брэсцкай і Гомельскай абласцях — па тры дарогі збудавалі, у Гродзенскай — адну, Мінскай — дзве, Магілёўскай — тры (і адну завяршаюць).

Як адзначылі ў прэс-службе, павелічэнне працягласці транспартнай сеткі ў лесе абумоўлена тым, што павялічваюцца штогод разліковыя лесасекі, трэба своечасова праводзіць лесаўзнаўляльныя працы, змагацца з хваробамі й шкоднікамі лесу, эфектыўна ліквідоўваць лясныя пажары. Да таго ж, што немалаважна, новыя лесагаспадарчыя дарогі палягчаюць доступ людзям да прыродных багаццяў (а гэта ягады, грыбы, бярозавы сок…), звязваюць паміж сабой невялікія сельскія населеныя пункты.

БЕЛТА



Лясныя дарогі: і зручнасць, і прыгажосць

Адзначым, што будаўніцтва лесагаспадарчых дарог рэгулюецца Дзяржпраграмай “Беларускі лес”. За апошнія 10 гадоў толькі сіламі лясгасаў у краіне пракладзена каля тысячы кіламетраў такіх дарог. Па выніках пяцігодкі (2016–2020) у эксплуатацыю будзе ўведзена не менш за 500 км.

Раней Кіраўніком дзяржавы была пастаўлена задача: штогод будаваць не менш за 100 км лесагаспадарчых дарог.

## Арына Сабаленка патрапіла ў дзясятку!

Вядомая беларуская тэнісістка Арына Сабаленка вярнулася ў топ-10 рэйтынгу WTA. Пры тым выціснула з прэстыжнай групы амерыканку Серэну Уільямс. Арына стала гэтай восенню чэмпіёнкай і ў адзіночным, і ў парным разрадзе



Арына Сабаленка ўмее перамагаць

на турніры ў Астраве (Чэхія) — прафесійных спаборніцтвах высокага ўзроўню. Гэта быў першы пераможны дубль у кар’еры 22-гадовай Арыны. Ніколі раней яна не заканчвала сезон у дзясятцы сусветнага рэйтынгу.

І вось нядаўна Арына Сабаленка, справіўшыся з Эліс Мерценс (Бельгія) выйграла прэстыжны турнір у Аўстрыі (Лінц), замацаваўшы свае пазіцыі.

**Падрыхтаваў Іван Ждановіч**

ЮБІЛЕЙ

# Даніна любові Уладзіміру Караткевічу

## 90-я ўгодкі класіка беларускай літаратуры адзначаюцца на Бацькаўшчыне. І ў замежжы — таксама!



**Уладзімір Караткевіч. 26 лістапада 1968 года. Здымак Сяргея Панізьніка з памятнага святкавання дня нараджэння.**

Днямі апублікаваныя нататкі з круглага стала, які правяла вядомая пісьменніца, журналістка Людміла Рублеўская (гл. у нэцце: "Ён быў прарок, ён быў рамантык. У чым прыцягальнасць асобы Уладзіміра Караткевіча" — Звязда, 25.11.2020). Да размовы былі запрошаныя — каб пагаварыць пра Караткевіча ды ягоную спадчыну — вядомыя ў беларускай культурнай прасторы людзі. Сярод іх — літаратуразнаўца, дацэнт кафедры гісторыі беларускай літаратуры філфака БДУ Анатоль Верабей. Ён адзначыў: "Уладзімір Караткевіч быў, ёсць і будзе прадвеснікам Адраджэння, апосталам беларускасці, рыцарам чалавечнасці, сумлення й свабоды. Ён — пісьменнік пераважна рамантычнага тыпу мыслення. І тым значны як геній ды класік. Хацеў бы, каб ягоны рамантызм не ўспрымалі павярхоўна, як штосьці наіўнае, несур'ёзнае, недасканалае. Ён вялікі, як Уільям Шэкспір, Адам Міцкевіч, Аляксандр Пушкін, Янка Купала".

Намеснік гендырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Алесь Суша згадаў у часе размовы й пра выставу **"З кніг Уладзіміра Караткевіча"**, што адкрылася да юбілею ў бібліятэчным Музеі кнігі. Там упершыню прадстаўлены кнігазбор пісьменніка з ягонага кабінета, прычым асноўнае месца ў экспазіцыі занялі экслібрысы: "Значная іх частка зроблена самім пісьменнікам. На выявах — Скарына, Гусоўскі, любімыя Караткевічам ветразі. Вылучаецца экслібрыс з абрысамі зброі касінераў. Унікальныя дароўныя надпісы на кнігах уводзяць у сяброўскае й творчае кола пісьменніка. Змена ракурсаў, іншае асвятленне: пісьменнік становіцца чытачом, але й бачна, як чытач гэты паступова стаў пісьменнікам, як пашыралася ягонае кола кантактаў і кола чытання. Мы вельмі ўдзячныя захавальнікам спадчыны Уладзіміра Караткевіча — сям'і пляменніцы пісьменніка Алены Іванаўны Сінькевіч".

У дасланым і ў нашу рэдакцыю прэсрэлізе — за што ўдзячныя спадару Алесю! — згаданыя таксама экслібрысы, створаныя для пісьменніка мастакамі. Якія імёны! Арлен Кашкурэвіч, Мікола Купава, Уладзімір Басалыга, Іосіф Капелян, Генадзь Грак ды Вячка Целеш — вядомы актывіст беларускага руху ў Латвіі. А дароўныя надпісы на кнігах уводзяць нас у сяброўскае й творчае кола пісьменніка — скажам, прадстаўлены аўтографы Адама Мальдзіса, Васіля Быкава, Рыгора Барадуліна, Янкі Брыля ды іншых, і нават па-караткевічаўску жартаўлівы аўтограф… самому сабе.

Яшчэ адзін праект НББ — выстава ў галерэі "Мабільная" пад назвай **"Княства вобразаў і слоў"**, таксама прымеркаваная да юбілею Уладзіміра Сямёнавіча. Экспазіцыю падрыхтавалі спецыялісты бібліятэкі супольна з Беларускім саюзам мастакоў. Бо ён жа быў і мастаком: спецыялісты налічылі больш за 600 выяў. У малюнках на гістарычную тэму пісьменнік дакладна выпісваў дэталі касцюма, зброі, сілуэты й характэрныя рысы герояў. Гэтыя выявы, пэўна ж, дапамагалі ў часе працы над тэкстамі.

Тэматычная выстава **"Сын Зямлі пад белымі крыламі"** зладжана ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі. Дарэчы, якраз гэтая бібліятэка сёння — захавальніца найвялікай часткі дакументальнай спадчыны пісьменніка. І выстава дае нам унікальную магчымасць зазірнуць у святая святых — творчую лабараторыю Майстра слова, паглыбіцца ў атмасферу, у якой нараджаліся героі ягоных твораў. Дакументы з асабістага архіва пазначаюць асноўныя этапы жыцця й творчасці. Кожны з іх — сам па сабе сапраўдны рарытэт, мае асабістую аўру: ці то з'яўляецца сведкам творчага працэсу, ці то распавядае пра гісторыю стварэння таго ці іншага твора. Сярод экспанатаў — чарнавікі, аўтографы паэтычных твораў: ад першай публікацыі вершаў у газеце "Ленінскі прызыў" да апошняй — верша, прысвечанага Васілю Быкаву. Можна пабачыць рукапісы твораў 50-х гадоў з цікавымі малюнкамі пісьменніка, раманаў "Каласы пад сярпом тваім", "Хрыстос прызямліўся ў Гародні", "Чорны замак Альшанскі", шматлікіх аповесцяў і апавяданняў, эсэ, казак.

А што мы ведаем пра Караткевіча як драматурга, кінасцэнарыста? Звычайна — зусім мала. На выставе ж можна пабачыць рукапісы п'ес "Маці ўрагану", "Калыска чатырох чараўніц", "Кастусь Каліноўскі". Ёсць і афіша прэм'еры згаданага спектакля (пастаўлены ў Беларускім дзяржаўным акадэмічным тэатры імя Якуба Коласа), з аўтографамі ўдзельнікаў. Рарытэт! А кінематаграфічную дзейнасць творцы адлюстроўваюць сцэнары мастацкіх фільмаў, фатаграфіі асобных кадраў з кінафільмаў, сярод якіх — "Хрыстос прызямліўся ў Гародні".




Яшчэ найкаштоўныя экспанаты — гэта дакументы часоў вучобы Уладзіміра Караткевіча ў Кіеўскім дзяржуніверсітэце, запісныя кніжкі, узоры перапіскі. Дэманструюцца цікавыя й рэдкія фотаздымкі з сямейнага альбома Караткевічаў, малюнкі пісьменніка на гістарычны тэмы, ілюстрацыі да ўласных твораў, яго эцюды (падпісаныя "УК"). Ёсць і партрэтныя замалёўкі, сяброўскія шаржы на пісьменніка, выкананыя рознымі асобамі.

У асобным раздзеле экспазіцыі сабрана ці не ўся друкаваная спадчына пісьменніка: ад першых выданняў паэтычных зборнікаў да салідных збораў твораў. Дарэчы, ён і цяпер — адзін з самых папулярных у беларускіх чытачоў, часта перавыдаецца. Асобныя блокі прысвечаны перакладам твораў Караткевіча на розныя мовы, даследаванням навукоўцаў пра яго жыццё й творчасць, успамінам сяброў, сваякоў, літаратараў, мастакоў, артыстаў, кнігі з дарчымі надпісамі.

Да юбілею Музей Літаратуры падрыхтаваў часовую літаратурна-мастацкую экспазіцыю **"Уладзімір Караткевіч у выяўленчым мастацтве"**. А Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі ў гэтыя дні паказвае **спектакль "Наш Караткевіч"**, там разгорнута **выстава "Уладзімір Караткевіч. Быў. Ёсць. Буду…"** і зладжаны буккросінг — спецыяльна да юбілею класіка. Не выпадкова згадваем тэатр і музей побач: між імі ёсць творчая супраца. І святкаваць "Год Караткевіча" ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры пачалі ўвесну: праектам "Чытаем класіку разам". Гэта былі анлайн-чытанні рамана Уладзіміра Караткевіча "Каласы пад сярпом тваім", у якіх паўдзельнічалі культурныя і грамадскія дзеячы, вядомыя артысты, журналісты Беларусі. А ў часе згаданага спектакля выстава ў тэатры ўладкавана з матэрыялаў, прадстаўленых Музеем Літаратуры: гэта кнігі, фатаграфіі й сувеніры, што маюць дачыненне да жыцця й творчасці пісьменніка.

На заканчэнне — пра ўшанаванне памяці Майстра ў Латвіі. Яшчэ ў жніўні, мы пісалі, Латвійскае таварыства беларускай культуры "Сьвітанак" правяло ў Рызе святочную імпрэзу з нагоды юбілею. У часе якой, нагадаем, пра сяброўства з Уладзімірам Караткевічам расказаў рыжскі мастак, грамадскі й культурны дзеяч, кавалер Ордэна Трох Зорак Рэспублікі Латвіі Вячка Целеш. А днямі Жанна Рамановская з Даўгаўпілса паведаміла: там праходзіць конкурс малюнкаў паводле кнігі "Казкі Янтарнай краіны". Але пра тое мы раскажам наступным разам. Чакаем таксама іншых вестак з беларускіх суполак замежжа.

**Іван Ждановіч**

ЛІТАРАТУРНЫЯ МАСТЫ

# У Бялградзе, на пачэсным пасадзе

**Даяна Лазарэвіч даслала відэавестку з Сербіі: там выйшаў з друку зборнік паэзіі Янкі Купалы — у яе перакладах**

Гэтая пісьменніца, перакладчыца, бачыцца мне, цяпер — у ліку найбольш актыўных літаратараў замежжа, хто дзейсна спрыяе пашырэнню ў сваёй краіне беларускай літаратуры. Мы пісалі раней: Даяна Лазарэвіч пераклала ўжо на родную ёй мову зборнік "Вянок" Максіма Багдановіча ("Дзякуй, Даяна! — ГР, 27.07.2017). Падзея была ўнікальная: кніга "Венац" выйшла ў Бялградзе да 100-годдзя з дня памяці паэта, яе прэзентацыя была ў Мінску: у Літаратурным музеі Максіма Багдановіча. Спецыяльна ў Мінск прыязджала перакладчыца. Мы згадвалі: сярод тых, хто спрыяў выхаду кнігі ў Сербіі — вядомы славіст, доктар філалагічных навук, акадэмік Сербскай акадэміі навук Іван Чарота й былы Амбасадар Беларусі ў Сербіі Уладзімір Чушаў. Былі ў Даяны іншыя цікавыя перакладчыцкія праекты, але ж гэты, відаць, найбольш значны ў апошнім часе.

Адкрываем відэа. "Добры дзень! З вамі гаворыць Даяна Лазарэвіч — перакладчыца з Бялграда, з Сербіі". Бачна, што сяброўка нашай краны ў добрым настроі. Дзеліцца з сябрамі ў Беларусі цудоўнай навіною: выйшаў зборнік паэзіі Янкі Купалы на сербскай мове ў яе перакладзе. Здзейсніла выданне выдавецтва "Алма" ў Бялградзе, наклад зборніка — 300 асобнікаў. "Кніга цудоўная! І я вельмі ганаруся, што яна выйшла, — кажа Даяна Лазарэвіч. — Нават не магу вам выказаць, наколькі я шчаслівая! Што такая пярліна беларускай літаратуры выйшла ў Сербіі! Што мне выпаў вялікі гонар — быць перакладчыцаю гэтай кнігі!".

Далей Даяна прачытала вядомы верш Янкі Купалы "Спадчына" на сербскай мове, які, прызнаецца, вельмі-вельмі любіць у арыгінале. Віншуем з новым творчым поспехам, шаноўная Даяна: і вас, і згаданага ўжо прафесара Івана Чароту — ён выступіў складальнікам зборніка. Вашая дзейнасць, безумоўна, спрыяе адладжванню культурных сувязяў паміж братнімі Беларуссю й Сербіяй.

Напрыканцы заўважым, што відэавестку ад Даяны Лазарэвіч пераслаў нам і Алесь Суша — намеснік гендырэктара Нацыянальнай бібліятэкі, старшыня Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў. Прычым у ягоным пісьме прозвішча перакладчыцы напісана: Лазарэвіч. Мы спрабавалі ўступіць у спрэчку: маўляў, Даяна пісала, што яна — лАзаравіч, а не лазарЭвіч. Я пра тое спецыяльна ў яе цікавіўся, да таго ж мы ў супрацы: яна й мае вершы пераклала, друкавала на сербскай мове ў адным з часопісаў. Аднак спадар Алесь аргументаваў сваю пазіцыю маўленнем самой перакладчыцы — спасылка на відэа тут: https://drive.google.com/file/d/1AqNiVg?8rW1jAjwsqJtpIWk7_4uaRQME/view. І яшчэ патлумачыў: прозвішча мае націск на перадапошні склад, па-сербску Лазаревић. Паводле правілаў перадачы замежных прозвішчаў на беларускую мову, націск у іх не мяняецца. А калі так, разважае Алесь Суша, то пасля зацвярдзелага "р" можа пісацца толькі націскное "э", але ніяк не "е", і не "а".



**Даяна Лазарэвіч з кнігай**

Прымаем слушныя аргументы — што й бачна ўжо ў гэтым тэксце.

**Іван Ждановіч**

# Родныя твары ў Новасібірску

У супрацы з Новасібірскім цэнтрам беларускай культуры таленавіты фотамайстар Андрэй Чардакоў рэалізаваў фотапраект “Гісторыі беларусак у тварах”. Дзякуючы яму гожа, з нацыянальным каларытам створаны мастацкія вобразы беларускіх дзяўчат і жанчын, якія жывуць у Новасібірскай вобласці.

Спачатку — трохі пра надзённае. Супраца з няштатнымі аўтарамі ў розных краінах — вельмі важны складнік маіх клопатаў у рэдакцыі газеты “Голас Радзімы”. Па электроннай пошце адладжана перапіска з дзясяткамі сяброў выдання ў замежжы: паводле маіх падлікаў, такіх кантактаў звыш 50. Гэта, безумоўна, вымагае часу. Даводзіцца ж адрывацца ад “канвеера”, на якім “збіраецца” чарговы нумар. Затое й свежыя факты пра падзеі ў дыяспары заўсёды пад рукой. І ў газеце таксама. Несумненна, такія кантакты — справа ўзаемавыгадная: і для інфарматараў, і для выдання, адрасаванага ў першую чаргу актывістам дыяспары ды шырокаму колу іншых чытачоў.

Вось і з метадысткай Новасібірскага цэнтра беларускай культуры Таццянай Нялюбінай склаліся ў нас дзелавыя, творчыя стасункі. У тэксце “Пяць беларускіх дзён у Сібіры” (ГР, 15.11.2020) Таццяна згадала праект “Гісторыі беларусак у асобах”. На нашай просьбе напісала пра яго больш падрабязна ды аператыўна даслала тэкст са здымкамі ў рэдакцыю. Спланавалі ў бліжэйшы нумар. А рыхтуючы тэкст да друку, я выпадкова высветліў: адзін з вядомых беларускіх інтэрнэт-рэсурсаў ініцыятыву “перахапіў” ды ўжо выставіў тэкст — адзін у адзін такі ж, як нам быў дасланы. З шэрагам недакладнасцей, дарэчы, якія, на добры толк, варта б адрэдагаваць. Разумеем: любая публікацыя — гэта й “дэлегаванне” аўтарскіх правоў публікатару. Таму, паважаючы такія правы, падаем факты з тэкста ў пераказе. На будучыню просім аўтараў: не дасылайце ідэнтычныя тэксты ў розныя беларускія выданні — бо гэта ж адно інфаполе. А судзіцца за парушэнне аўтарскіх правоў нам ахвоты няма. Лепш у розныя выданні дасылаць розныя тэксты: каб і самаплагіяту не было, і не ствараць нагодаў для судовых разбораў між выданнямі.



Таццяна Нялюбіна, Маша Гасюк, Анастасія Дзяменцьева

Цяпер — пра сам творчы праект “Гісторыі беларусак у тварах”. Як вядома, Сібір стала другім домам для сотняў тысяч беларусаў і беларусак. І цяпер там жыве іх, мусіць, не менш (бо куды ж ім было падзецца!) — многія толькі асіміляваліся ды пішуцца ўжо рускімі. А каб трохі бліжэй угледзецца ў твары суплямённіц у Сібіры, актывісты Новасібірскага цэнтра беларускай культуры задумалі фотапраект, які набыў назву: “Гісторыі беларусак у тварах”. Урэшце атрымаліся не проста будзённыя фотаздымкі, а далікатнае судакрананне з рознымі беларускімі лёсамі. Ну а “жаночы твар” вымалеваўся ў праекта ў немалой ступені таму, што сярод актывістаў дыяспары “прыгожая палова” пераважае. Да таго ж, піша Таццяна Нялюбіна, жанчыны заўсёды ахвотней згаджаюцца на ўдзел у розных творчых эксперыментах. І ўвогуле: хто ж, як не этнічная беларуска ў нацыянальным строі, можа найлепш перадаць прыгажосць і адметнасць свайго народа! У супрацы Цэнтра з фотамайстрам Андрэем Чардаковым (ягоны партрэт, узяты з інтэрнэта, мы таксама падаём) і з’явіліся высокамастацкія фотаздымкі беларускіх дзяўчынак, дзяўчат і жанчын з Новасібірскай вобласці.

У ліку тых, каго бачым на здымках — наша раней актыўная няштатная аўтарка **Людміла Бяляўская**, сябар Саюза журналістаў Расіі. Магчыма, сталыя чытачы памятаюць яе жывыя, напоўненыя светлай тугой па Бацькаўшчыне тэксты. Спадарыня Людміла пісала пра бацьку-гарманіста, ветэрана вайны й працы Уладзіміра Дзмітравіча Бяляўскага, пра родныя мясціны, блізкіх людзей з горада Кіраўска, што на Магілёўшчыне — пра ўсё тое, што заўсёды падсілкоўвае беларуску ў Сібіры жыццёвай энергіяй. Цешыла спадарыню Людмілу, што “пад татаў гармонік паспеў паскакаць і яго маленькі сібірскі праўнук Вадзім. Нашу хату на той час ужо знеслі, а бацькі мае паспелі пажыць і ў добраўпарадкаванай кватэры новай шматпавярхоўкі”. (“Роду нітачка несканчоная” — ГР, 18.01.2018.)

Яскравыя ўражанні пра Беларусь з дзяцінства і ў **Анжалікі Нясцёркінай** — у прыватнасці, пра вёску Дзямідавічы Нясвіжскага раёна, адкуль родам яе бацька. У тэксце Таццяны Нялюбінай чытаем: “У памяці ўсплывае ельнік, з узлеску якога быў цудоўны краявід з сажалкай, у якой мы любілі купацца. Вядома ж, хата з печчу, у якой бабуля гатавала нам беларускія стравы: няхітрыя, але вельмі смачныя!”. Было б цікава пачытаць: як аказаўся беларус з Дзямідавіч у Сібіры ды які працяг мае там ягоны род. Дарэчы, і ў адной галіны майго роду карані — з Нясвіжчыны: з Малой Быхаўшчыны.

На фотаздымках ёсць і дзве Валянціны, сяброўкі з дзяцінства: жылі ў суседніх вёсках Быхаўскага раёна, вучыліся ў адной школе ды амаль 40 гадоў таму разам паехалі ў Сібір. **Валянціна Нячаева** дагэтуль бачыць у снах вёску Ветранку (націск на е): вырасла, прызнаецца, пры лесе, слухаючы гоман дрэў і спевы птушак. І тое райскае месца ёй і сёння сніцца. Для **Валянціны Самсонавай** малая радзіма — гэта суседняя з Ветранкай вёска Кузькавічы. Яе таксама саграваюць успаміны маленства: “Нарадзілася на хутары, можна сказаць, у беларускіх балотах. І ўсё яшчэ памятаю птушыныя спевы, дзівосныя водары скошанай травы…”



Соня Дуліна



**Фотамайстр Андрэй Чардакоў**

Пэўна, няма такіх яркіх вясковых успамінаў у былой мінчанкі **Марыі Белакурскай**, салісткі Новасібірскага акадэмічнага тэатра оперы й балета. Ды ўсё ж беларускае паветра й для яе — найбольш свежае ды "смачнае". Прынамсі, так Марыя расказала Людміле Нялюбінай. Ураджэнка Смаргоні **Марына Лапкіна** прыехала ў Сібір услед за мужам, доўга пажыўшы і ў Мінску. Яе Беларусь — гэта "родная хата, бацькі, спакой, прыгожыя твары людзей, буслы, валошкі, шматлікія азёры й пах сапраўдных яблыкаў".

А ў кіраўніцы Новасібірскага цэнтра беларускай культуры, спявачкі **Анастасіі Дзяменцьевай** родам з Беларусі бабулі й дзядулі. Адна з іх, Кацярына Лук'янаўна Зашчытава, — з Гомельшчыны. У дзяцінстве Анастасія і ўявіць сабе не магла, што беларускія песні бабулі так паўплываюць на яе лёс, прывядуць у ЦБК. Што да песень беларускіх, то ў іх, відаць, і сапраўды ёсць вялікая магічная сіла. Вось і **Алеся Матвеева**, яшчэ адна з удзельніц фотапраекта, згадвае, як маці перад сном спявала ёй у маленстве розныя песні, але засынала дзяўчынка толькі пад беларускую калыханку.

З самых юных беларусак Новасібірска засвяціліся ў праекце "Гісторыі беларусак у тварах" **Светачка Басава** ды **Паліна Сямёнава**. Яны, чытаем у тэксце, вельмі ганарацца сваімі прадзядулямі. Бо першая — праўнучка Уладзіміра Паўлавіча Драздова, старшыні Сібірскага рэгіянальнага саюза "Чарнобыль", а другая — Мікалая Паўлавіча Роўбы, афіцэра ў адстаўцы, які родам з Міншчыны, у Сібір трапіў па службе. Дарэчы, і пра кожнага з іх, пэўна, можна расказаць на старонках нашай газеты.

Яшчэ важны момант адзначым: у Новасібірску шануюць памяць пра папярэднікаў, ёсць моцная повязь пакаленняў. Скажам, нашы суплеменнікі памятаюць пра тое, што беларускія родавыя карані меў знакаміты акадэмік Валянцін Капцюг, і не менш вядомы ў Новасібірску акадэмік Андрэй Трафімук — таксама з нашага роду. Людміла Нялюбіна піша, што ўдзельніцай фотапраекта стала й **Соня Дуліна**: унучка Ніны Кабанавай, першай кіраўніцы, а таксама й стваральніцы вядомага цяпер Цэнтра беларускай культуры. Ніна Васілеўна родам была з вёскі Лазаравічы Быхаўскага раёна, 15 гадоў яна ўзначальвала Цэнтр. Дзяўчынка ганарыцца бабуляй ды кажа, што менавіта дзякуючы ёй з'явілася і ў яе цікавасць да творчасці. Загінула Ніна Кабанава 20 ліпеня 2015 года: па



**Марыя Белакурская**



**Валянціна Самсонава**

дарозе на дачу кіравала машынай ды на трасе Новасібірск — Кузбас трапіла ў аўтакатастрофу. Пасля той трагедыі мы падалі ў газеце спачуванні, накіраваныя ў ЦБК ад беларусаў Іркуцка. Там ёсць радкі: "Яна прыязджала да нас у Іркуцк. Знаёмілася з нашым актывам. Таксама мы, гурт "Крывічы", не аднойчы сустракаліся з Нінай Васілеўнай на розных мерапрыемствах у Новасібірску, Томску, Мінску ды іншых гарадах Расіі, Беларусі. Мы памятаем яе як адкрытую, самаахвярную, шчырую патрыётку Беларусі. Яна паклала шмат сіл ды энергіі на карысць адраджэння й развіцця Беларускай культуры. Таксама мы памятаем і сапраўдную гасціннасць Ніны Васілеўны. Яе годныя сустрэчы нашага гурта ў Новасібірску, яе клопат запалі нам у сэрцы".

Спадзяемся, і гэтыя цёплыя радкі пра сваю душэўную бабулю-беларуску, падрастаючы, Соня Дуліна будзе згадваць. Як і верш "Перад тварам Вечнасці", тады напісаны. Ён, дарэчы, і сёння надзвычай актуальны, — у пару, калі доўжыцца каранавірусная эпідэмія, і калі ў Беларусі ды й сярод беларусаў замежжа пэўныя дэструктыўныя сілы ўзяліся рэалізаваць драпежны, вар'яцкі, антыгуманны сцэнар "колеравай рэвалюцыі", унесці раздрай, раскол сярод нас, натравіць брата на брата. Перад тварам трагедый, якія ўжо адбыліся, і якія, на жаль, пры такім развіцці падзей непазбежныя — давайце задумаемся пра Вечнае.



**Людміла Бяляўская**



**Света Басава**

*Мы — розныя, бы колеры*
*вясёлкі,*
*І гэтым упрыгожваем*
*Зямлю.*
*Адкінем спрэчкі, крыўды*
*ці падколкі,*
*Што цэльны свет*
*здрабняюць — на асколкі…*
*Хай будзе нам малітваю:*
*"Люблю".*
*Імгненне — і ўзрываецца*
*бясконцасць…*
*Вясёлка — сімвал згоды*
*на Зямлі.*
*Мірыцця, пакуль не бачна*
*донца.*
*Мірыцеся, пакуль не згасла*
*Сонца.*
*Мірыцеся, пакуль*
*не адышлі…*

Як мы пісалі ўжо, прэзентаваўся праект "Гісторыі беларусак у тварах" 16 кастрычніка ў ЦБК, пры тым кожная гераіня атрымала падарунак: каляндар на 2021 год з фотаздымкамі ўсіх удзельніц. Месяц працавала й фотавыстава ў Доме нацыянальных культур імя Г.Д. Завалокіна. Фотапраект ужо стаў з'явай мастацтва, і такім чынам ён знітоўвае ў прыгожае палатно Беларускай Дыяспары адметныя лёсы-нітачкі сібірскіх беларусак. Да таго ж, піша Таццяна Нялюбіна, праз прызму такіх фотаздымкаў можна больш расказаць і пра кожную з гераінь. Прычым хоць у кожнай з іх — сваё жыццё, свой лёс і свая гісторыя, ды ўсе яны, безумоўна, маюць моцныя духоўныя повязі з гістарычнай Бацькаўшчынай.

І на заканчэнне. Мы ўдакладнілі ў Таццяны: у праекце "Гісторыі беларусак у тварах" паўдзельнічала 15 гераінь. Некаторыя здымкі вырашылі вось так, вялікім разваротам прадставіць. Але, піша Таццяна, "працяг мы абавязкова плануем у будучым годзе".

Дарэчы, працяг можа быць і міжнародным: у Беларусі. Супрацоўнікі ЦБК з цікавасцю ўспрынялі нашую прапанову-параду: паказаць мастацкія фотаздымкі прыгожых беларусак Сібіры й на іх гістарычнай Бацькаўшчыне. І прадпрымаюцца пэўныя захады, каб здзейсніць такі выставачны праект. Але пакуль не раскрываем падрабязнасцяў: як прыйдзе час — абавязкова раскажам.

**Іван Ждановіч.**

Фота: **Андрэй Чардакоў.**

Голас Радзімы пятніца, 27 лістапада, 2020



Карціна Міхаіла Гусева “Янка Купала і Ян Райніс”. 1959 г.

# Латыш з беларускім кодам у крыві

**(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)**

Дарэчы, у тыя часы й беларускія плытагоны спявалі свае песні, седзячы вечарамі ля вогнішчаў на берагах Дзвіны-Даўгавы.

У Беркенэлі прыехала з бацькамі дзіця, а праз 9 гадоў з ліпавай алеяй, сажалкай ды сядзібай развітваўся юнак — ехаў прадоўжыць адукацыю ў Рыжскай гімназіі ды Санкт-Пецярбургскім універсітэце. Ён прыязджаў на канікулы на сваю малую радзіму, дзе сустрэў першае каханне, меў першыя расчараванні. Дзіцячыя гады ўспамінаў з вялікай цеплынёй, называючы іх “сонечнымі”. У Латгаліі на дарожным паказальніку паэт знайшоў сабе творчы псеўданім, старадаўняе латышскае імя — Райніс: “… маё імя падабранае на бальшаку ў самым глухім куце Латвіі, а хто носіць яго, таму й хадзіць па бальшаках”. Паэт і сапраўды ўвесь час знаходзіўся ў дарозе — у прамым і пераносным сэнсе.

Нейкі час Райніс і ягоная жонка, паэтка Аспазія, думалі ўладкавацца ў Даўгаўпілсе на пастаяннае жыццё: калі паэт ствараў драму “Агонь і ноч”, жылі яны ў мясцовай гасцініцы. Але ў канцы 1905-га паехалі ў Швейцарыю. Пакідалі радзіму з чыгуначнай станцыі Калкуны, што на левым беразе Даўгавы. На тую ж станцыю праз 14 гадоў вярнуліся з эміграцыі: ужо ў Латвійскую Рэспубліку, і правялі ў Даўгаўпілсе адзін дзень. Пра тое цяпер сведчыць мемарыяльная дошка на будынку Даўгаўпілскага краязнаўчага й мастацкага музея. У кнізе памежнага кантролю паэт пакінуў запіс: “Райніс і Аспазія. Няхай жыве свабодная Латвія!”. Паэты адпачылі ў доме начальніка Даўгаўпілскай акругі, у якім цяпер знаходзіцца музей, пагулялі па крэпасці ды з чыгуначнай станцыі ад’ехалі ў Рыгу. Іх усюды сустракалі як нацыянальных герояў.

Райніс актыўна ўключыўся ў палітычнае жыццё маладой незалежнай дзяржавы. Ён быў адным з аўтараў Канстытуцыі, ад сацыял-дэмакратаў выбіраўся ў парламент, быў дырэктарам Нацыянальнага тэатра, Міністрам адукацыі, узнагароджаны Ордэнам Трох Зорак. Да таго ж у памяці людзей Яніс Райніс застаўся як абаронца правоў беларусаў Латвіі. У Сэйме ён прадстаўляў беларускую дыяспару краіны, пры ягоным удзеле адкрываліся беларускія школы й гімназіі. У Даўгаўпілсе на вуліцы Варшаўскай паспяхова працавала, маючы аўтарытэт у жыхароў, дзяржаўная беларуская гімназія. Пра тое нагадвае цяпер толькі мемарыяльная дошка на сцяне жылога шматкватэрнага дома. Дарэчы, у Латвіі сёння дзейнічае толькі адна беларуская школа — у Рызе, і яна носіць імя Янкі Купалы — беларускага Песняра, з якім Райніс пазнаёміўся на Акадэмічнай канферэнцыі па рэформе беларускага правапісу ў Мінску ў 1926 годзе. Тады й пачалася дружба двух першых народных паэтаў сваіх рэспублік.

У Даўгаўпілс Райніс яшчэ раз вяртаўся ў 1927 годзе — у статусе Міністра адукацыі. Нядзіўна, што бюст паэта ў гістарычным цэнтры горада ўсталяваны перад Даўгаўпілскім універсітэтам, дзе вывучаюць творчасць класіка латышскай літаратуры. Штогод там праходзяць Дні паэзіі, прымеркаваныя да 11 верасня: дня нараджэння Райніса. Сам Райніс быў выдатна адукаваны чалавек. Вядома, што ён, юрыст, дасканала валодаў нямецкай ды рускай мовамі, свабодна размаўляў на італьянскай, вывучаў французскую й латынь, гаварыў на латгальскай, літоўскай, беларускай, польскай, разумеў ідыш. З любым жыхаром Латвіі Райніс мог паразмаўляць на ягонай роднай мове! У палітыцы ён праславіўся як актыўны абаронца нацыянальных меншасцяў.

**Райніс з намі зАўсёды побач**

У двух кварталах ад месца, дзе ўсталяваны бюста паэта, ёсць вуліца Райня: між чыгуначнай ды аўтамагістралямі. Наогул, у сучаснай Латвіі няма горада “без Райніса”: ягонае імя носяць вуліцы, плошчы, бульвары, паркі, помнікі, музеі. Што цікава: на вуліцы Райня быў першы офіс Даўгаўпілскага Цэнтра беларускай культуры (адкрыты ў 1999 годзе), працавала Беларускае культурна-асветніцкае таварыства “Уздым”. Цяпер ЦБК — у гістарычным цэнтры на вуліцы Алейнай (Алеяс), якая перасякаецца з вуліцай Райня. Так што Райніс з намі — заўсёды побач.

І яшчэ адно месца Даўгаўпілса звязанае з імем Райніса: на Лютэранскіх могілках горада пахаваны бацька паэта, Крыш’яніс Пліекшанс (1825–1891). Ягоная магіла дагледжаная заўсёды. Ненамнога перажыла мужа й Дарта Пліекшанэ (1828–1899): яна пахаваная на Стара-Сямёнаўскіх могілках у Віцебску. Бо якраз у беларускім горадзе пад паліцэйскім наглядам пасля ссылкі знаходзіўся яе зяць, разам з ім паехалі туды ягоная жонка й цешча — гэта значыць сястра й маці Райніса. (Трохі удакладняем гэты факт. Вядомы паэт і, як і Райніс, кавалер Ордэна Трох Зорак Латвійскай Рэспублікі Сяргей Панізьнік у тэксце “Песні-вёсны — у дыфузіі культур” (інтэрнэт-сайт “Созвучие”, 19.04.2019) падае такую інфармацыю: “31 сакавіка 1899 года Райніса й Стучку як “палітычных злачынцаў” царская ўлады асуджаюць на высылку й пасяленне ў Вяцкую губерню. Дарта — уражлівы, сардэчны чалавек — не магла вытрымаць цяжару сямейных нягодаў. У тым жа 1899 годзе, пражыўшы ў Віцебску разам з дачкой Дорай, жонкай Пятра Стучкі, толькі год, яна 18 красавіка памірае ад кровазліцця ў мозг. Віцебская зямля прыняла яе на апошні схоў. Маці Райніса была пахаваная на старадаўніх Лютэранскіх могілках. Цяпер зарослы хмызняк можна знайсці на так званых Стара-Сямёнаўскіх могілках на Юравай Горцы”. Цікавае назіранне выпісаў спадар Сяргей, даўні вялікі сябар Латвіі, таксама й наконт магчымых беларускіх этнічных каранёў Райнісавай маці: “А нарадзілася маці Яніса Пліекшана ў 1928 годзе на хутары Грыкмалеі. Паходзіць з роду Грыкоўскіх. Сам Райніс пісаў у аўтабіяграфічнай паэме “Сонечныя гады”, што продкі ягонай маці з Вялікага Княства Літоўскага: “Па паданнях продкі маці з вольнае Літвы баяры” (пераклад Рыгора Барадуліна). Нечакана я выявіў, што на Гродненшчыне расце не грэчка, а грыка: цікавы пераклік з прозвішчам Грыкоўскага”. То можа было б цікава беларускім краязнаўцам з Даўгаўпілса капнуць глыбей: ці не тая грыка, вобразна кажучы, прыўнесла беларускі код у кроў знакамітага паэта? — **Рэд.**)

Яніс Райніс памёр у Юрмале ў 1929 годзе — на наступны дзень пасля таго, як яму споўнілася 64 гады. Незадоўга паэт напісаў дзяўчынцы, якая прыйшла да яго па аўтограф, апошнія ў сваім жыцці радкі: “Что скажет юному старик почтенный?/ — Живи достойно, не пеняй на жизнь!/ Достичь сего ты должен непременно,/ Есть заповедь — любить. Ее одной держись!”.

**Бацькоў магілы — маякі ў жыццёвым моры…**

Хачу расказаць яшчэ й пра тое, як імя Райніса паяднала Даўгаўпілс і Віцебск. 9 лістапада наш ЦБК сумесна з кафедрай літаратуры Віцебскага дзяржуніверсітэта імя Пятра Машэрава правялі акцыю памяці “Тыя, якія не забываюць”. Прысвечаная яна была 155-м угодкам Яніса Райніса (1865–1929) ды злучыла анлайн Даўгаўпілс і Віцебск. Наш цэнтр з універсітэтам — партнёры па супрацы, і была імпрэза з ліку тых, што ўключаны ў праграму нашых кантактаў на гэты навучальны год. Цяпер з-за каранавіруса шукаем новыя фарматы для дзейнасці, рэальныя сустрэчы пакуль немагчымыя — вось і прыдумалі вебінар на інтэрнэт-пляцоўцы Zoom.

З папярэдняга аповеду бачна: Даўгаўпілс і Віцебск звязаныя праз бацькоў Райніса, якія на могілках гэтых гарадоў пахаваныя. Дарэчы, тое, што ў Віцебску пахавана маці паэта ды ягонае заступніцтва за беларускую дыяспару Латвіі ў Сэйме заахвочвае даследчыкаў далей шукаць беларускія родавыя карані Райніса. А 2 лістапада, на Дзяды, у Дзень памяці продкаў, на магілы бацькоў Райніса леглі кветкі — у абодвух гарадах. (У згаданым тэксце Сяргей Панізьнік апавядае, што ў пошуках магілы Дарты Пліекшанэ дапамагаў яму віцебскі краязнаўца Мікола Плавінскі. “Мы прамінулі вароты да могілак, узведзеныя ў 1889 годзе. Недзе побач былі пахаваныя воіны Сямёнаўскага палка, палеглыя ў баях з напалеонаўскімі захопнікамі. Так паявіліся часткі могілак: лютэранская, праваслаўная, ваенная. А ўвогуле — гэта адзін з самых старых некропаляў у межах горада Віцебска. Мікола Плавінскі знайшоў камень-валун ля Лукішак, дзе рака Лучоса злучаецца з Дзвіной. У кастрычніку 1990-га валун паставілі непадалёк ад тых старых варотаў. Рыжане — скульптар Вілніс Тытанс, супрацоўнікі Музея Яніса Райніса — паспрыялі адкрыць помны знак на сімвалічнай магіле Дарты Пліекшанэ ў верасні 1991 года: да 126-й гадавіны народзінаў народнага паэта Латвіі”. — **Рэд.**)



У часе акцыі, прысвечанай памяці Яніса Райніса, у Віцебскім дзяржуніверсітэце імя Пятра Машэрава

А 6 лістапада акцыю “Тыя, якія не забываюць” працягнуў вебінар на пляцоўцы Zoom, у якім з беларускага боку паўдзельнічалі выкладчыкі кафедры літаратуры й студэнты, з латвійскага — супрацоўнікі ЦБК і паэты. Усіх віталі загадчыца кафедры Віцебскага дзяржуніверсітэта, дацэнт Алена Крыклівец і кіраўніца Цэнтра беларускай культуры, магістр Жанна Раманоўская. Мы, беларусы з Даўгаўпілса, спецыяльна да акцыі зрабілі згаданы відэафільм “Райніс і Даўгаўпілс” і паказалі яго віцебскім сябрам. Прафесар Віцебскага дзяржуніверсітэта Ванда Бароўка распавяла пра традыцыі Райніса ў беларускай літаратуры. Загадчыца кафедры, дацэнт Алена Крыклівец (сябар Саюза пісьменнікаў Беларусі, Саюза пісьменнікаў Расіі), а таксама дацэнт, празаік і літаратуразнаўца Ганна Навасельцава дзяліліся з удзельнікамі акцыі ўзорамі сваёй літаратурнай творчасці. Далей паэты з Даўгаўпілса Станіслаў Валодзька й Лілія Воранава чыталі свае вершы, прысвечаныя Райнісу, на беларускай мове, Фаіна Осіна — на рускай. Апошняя распавяла й пра штогадовыя Дні паэзіі ды паэтычныя зборнікі, прымеркаваныя да ўгодкаў класіка. Метадыстка ЦБК Марыя Памецька расказала пра Райніса як абаронцу беларускай культуры, выкарыстоўваючы матэрыялы дакладу доктара філалогіі Валянціна Лукашэвіча.

На мове арыгінала вершы Райніса чытала Ірына Апейнанэ, а іх пераклад на беларускую дублявала Галіна Сантоцкая. Дарэчы, у бібліятэцы ЦБК ёсць кніга выбранай паэзіі Райніса на беларускай мове: пераклады зрабілі вядомыя літаратары Беларусі. Завяршылі паэтычнае чытанне радкі верша “Тыя, якія не забываюць” — па назве нашай акцыі памяці.

Як адзначала пазней Алена Крыклівец, вебінар даў магчымасць беларускім студэнтам больш даведацца пра асобу й літаратурную дзейнасць латышскага паэта. Пры тым калегі з Віцебска й Даўгаўпілса змаглі абмяняцца творчымі й навуковымі ідэямі, дамовіцца аб формах далейшай супрацы. Да таго ж мы ўсе пераканаліся: ніякія вірусы й закрытыя дзяржаўныя межы не замінаюць супрацы, зносінам і культурнаму ўзбагачэнню! Так што будзем прымаць “выклікі часу” ды шукаць новыя фарматы. У часе вебінару прагучала ідэя: падрыхтаваць і выдаць зборнік вершаў, прысвечаных Райнісу. Абмяркоўвалася ідэя ўстанавіць ў Даўгаўпілсе вялікі помнік Янісу Райнісу. Мы згадалі, што ёсць яшчэ адна гістарычная асоба, якая злучае два гарады — гісторык Аляксей Парфенавіч Сапуноў. Ягоны бюст усталяваны перад універсітэтам у Віцебску, а ў Даўгаўпілсе нядаўна выйшла факсімільнае перавыданне працы “Инфлянты: Историческія судьбы края, известнаго под именемъ Польскихъ Инфлянтъ” (якая ўпершыню выйшла ў Віцебску ў 1886 годзе). Так што наша супраца з віцебскімі партнёрамі ў фармаце анлайн прадоўжыцца.

**Жанна Раманоўская,**
кіраўніца Цэнтра
беларускай культуры, г. Даўгаўпілс.
Фота: **Ірына Апейнанэ.**

**Ад рэдакцыі.** У лісце ў рэдакцыю Жанна Раманоўская дадае: вебінар з Віцебскам для беларусаў Даўгаўпілса тым асабліва каштоўны, што пачаўся “творчы рух” у шматаблічных “сасудах”, перарваных каранавіруснай пандэміяй, што злучаюць іх з Бацькаўшчынай. Звычайна ж, мы ведаем, паездак ды кантактаў штогод шмат. А сёлета, паведамляе кіраўніца ЦБК й таварыства “Уздым”, “у лютым былі мы толькі ў Мінску, у Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры. Забралі там перасоўную выставу пра сёлетняга 90-гадовага юбіляра Уладзіміра Караткевіча — вось і ўсё”.

Будзем спадзявацца на лепшае — і прыдумваць, выпрабоўваць новыя фарматы ў працы беларускіх суполак. Пра некаторыя з іх, дарэчы, можна пачытаць і ў нашай газеце.

**КАШТОЎНЫ ДОСВЕД**

# Школцы-“Вясёлцы” цяпер 25!

## Беларуская нядзельная школа ў Даўгаўпілсе, праз якую прайшло звыш 150 вучняў, адзначала юбілей анлайн з выкарыстаннем Zoom-платформы



Юбілей школы — гэта і свята яе педагогаў розных гадоў

Сёлета ўвосень з-за каранавіруса школа “Вясёлка” так і чакае выхаванцаў, а 25 кастрычніка 2020 года сустракала гасцей. І свята ў нас атрымалася анлайн!

У ранейшыя гады першы званок у школе гучаў, калі адзначаўся Дзень настаўніка. Сёлета ж навучальны год мы пачалі… у Рызе: удзелам у свяце “Vienoti sporta!” (“Адзіныя ў спорце!”). Паездка ўдалася дзякуючы праекту таварыства “Уздым” і суфінансаванню Даўгаўпілскай гардумы. А Свята першага званка правялі, адзначаючы 25-годдзе беларускай школы, якая працуе пры таварыстве “Уздым” у памяшканні Цэнтра беларускай культуры (ЦБК). І па “каранавірусных” прычынах першы тэматычны ўрок прайшоў у новым фармаце: з выкарыстаннем Zoom-платформы.

Зала, дзе праходзіла ўрачыстасць, была ўпрыгожана. Завіталі да нас консул Генконсульства Беларусі ў Даўгаўпілсе Галіна Найдзёнава, старшыня таварыства “Уздым” і кіраўніца ЦБК Жанна Раманоўская, чалец Саюза пісьменнікаў Беларусі паэт Станіслаў Валодзька, бацькі ды настаўнікі. Пачалася імпрэза з “Песенкі вясёлкі” на словы Станіслава Валодзькі (музыка Альберта Белуся) — спявала супрацоўніца ЦБК Настасся Лукашонак. Дарэчы, прэм’ера песні (выконваў вакальны гурт “Пралескі”) была на свяце 20-годдзя школы — і стала песня школьным гімнам.

Першыя сёлетнія школьныя заняткі мы прысвяцілі Дню пісьменства ў Беларусі, які, як вядома, штогод праходзіць на пачатку верасня. Распавялі, што адбываецца на падобных святах, а прэзентацыя Алены Радзівонавай пазнаёміла з іх слаўнай гісторыяй. А пра дзейнасць беларускіх школ у першай палове XX стагоддзя ў Латвіі расказаў краязнаўца Мікола Паўловіч. Ён жа зладзіў цікавую выставу падручнікаў для беларускіх школ розных часоў. Потым я расказала пра галоўныя дасягненнямі “Вясёлкі”, для нагляднасці скарыстоўваючы падрыхтаваную разам з Аленай Радзівонавай фотапрэзентацыю.

А ганарыцца нам ёсць чым! У школе традыцыйна праходзяць святы першага і апошняга званка, Каляды, Вялікдзень. Адзначаюцца Гуканне Вясны, Саракі, Купалле, Дажынкі, Багач. На ўрокі запрашаем цікавых асоб. У нас бывалі ўнучка Якуба Коласа й Янкі Маўра Марыя Міхайлаўна Міцкевіч, майстрыха з Браслава Ларыса Дарафейчык, паэт Станіслаў Валодзька, краязнаўца Мікола Паўловіч, студэнты мясцовага ўніверсітэта, настаўніца з Браслава Віта Чэркас і дзеці Браслаўскай гімназіі. Выхаванцы “Вясёлкі” ўдзельнічаюць у розных віктарынах і конкурсах, знаёмяцца з творчасцю беларускіх пісьменнікаў, вывучаюць беларускую мову. Яшчэ адзначу, што ў працы школы ўдзельнічае моладзь “Уздыма”. Такая дапамога надзвычай патрэбная, калі ладзім святы й заняткі, рыхтуем ды ажыццяўляем культурнаадукацыйныя праекты. Вучні школы ўдзельнічаюць і ў святах “Уздыма”: без нас не абыходзіцца “Беларускі кірмаш”, “Гуканне Вясны”, Дні беларускай культуры… Нашы вучні наведалі Браслаўскую гімназію, Рыжскую беларускую асноўную школу, былі на Прэзідэнцкай ёлцы ў Мінску, паўдзельнічалі ў міжнародных конкурсах малюнкаў па творах Пімена Панчанкі, Янкі Маўра, Еўдакіі Лось, неаднаразова ўдзельнічалі ў згаданым спартыўным свяце ў Рызе, хадзілі ў паходы — з начлегам ды вогнішчам. Нашу дзейнасць падтрымліваюць бацькі.

Варта згадаць тых, хто працаваў у розныя гады ў “Вясёлцы”: гэта Вольга Паўловіч (заснавальніца школы, першая настаўніца, і цяпер праводзіць заняткі па беларускай мове), Тацццяна Бучэль (праводзіла гістарычныя конкурсы), Галіна Сантоцкая (ладзіць традыцыйныя беларускія святы, знаёміць дзяцей з беларускім фальклорам). У свой час настаўнікам дапамагалі Маргарыта Мілушава й Зінаіда Сіліня, Аннітэ Петкунэ (займалася з дзецьмі тэатральнай дзейнасцю). У мяне ж цяпер “пасада” куратара школы, я рыхтавала дакументы для атрымання школай ліцэнзіі, пісала праекты, якія фінансаваліся Даўгаўпілскай гарадской і краявой думай, праводжу заняткі па беларускай літаратуры, пішу сцэнары святаў для дзяцей. Тацццяна Блізнакова праводзіць музычныя заняткі, рыхтуе выступленні дзяцей на святах, а згаданая Алена Радзівонава — настаўніца гісторыі, арганізатар конкурсаў малюнкаў ды святаў.

На юбілейнай імпрэзе мы слухалі па відэасувязі вершы, якія чыталі вучні “Вясёлкі” Сафія Блізнакова ды Павел Кузьміч. Са святам дзяцей і настаўнікаў павіншавала консул Галіна Найдзёнава, пры тым настаўнікі атрымалі падзякі ад консульства. І Саюз беларусаў Латвіі (СБЛ) даслаў нам віншавальны ліст.

Цёплыя словы падзякі за працу настаўнікам выказала Жанна Раманоўская ды ўручыла нам падарункі, якія спатрэбяцца на занятках, кветкі настаўніцам. Вучні ж атрымалі й асабістыя падарункі: нататнікі, фірменныя пакеты з эмблемай школы, ручкі й беларускія шакаладкі. Павіншаваў нас і паэт Станіслаў Валодзька: чытаў свае жартоўныя вершы, загадваў загадкі, падарыў школе сваю кнігу “Калі ласка, казка”.

Ад імя настаўнікаў Вольга Паўловіч падзякавала за віншаванні, за ўдзел у свяце ды ўручыла Жанне Раманоўскай падарунак ад настаўнікаў — з падзякай за падтрымку школы. Вольга казала й пра тое, што рыхтуецца да выдання кніга пра 25-гадовы юбілей школы. Ад імя бацькоў добрыя словы казалі Айна Марчанка, Тацццяна Дзянісава, Людміла Абарон. Дарэчы, сёлета запісаліся ў школу новыя вучні — дзеці супрацоўнікаў Беларускага консульства ў Даўгаўпілсе. Згадвалі мы й сваіх выпускнікоў. І што ў 2016-м школу закончылі Ксенія Славецкая ды Ілона Раманоўская, а ў 2019-м атрымалі першыя пасведчанні аб заканчэнні школы Караліна Казачонак, Надзея і Марына Чарновы. Цікавымі ўспамінамі пра сваю вучобу ў школе падзялілася Алена Бучэль, а яна ўжо водзіць у школу сваіх дзетак: Паўла й Кацярыну.

Мы віншавалі выхаванцаў “Вясёлкі”, якія паспяхова ўдзельнічаюць у міжнародных конкурсах малюнкаў. За ўдзел у конкурсе “Родны край маіх дзядоў” (праект “Уздыма”) падзякі атрымалі: Кацярына Кузьміч, Акім Воранаў, Арвід Сантоцкі, Ева Малышава, Надзея й Марына Чарновы. За ўдзел у конкурсе Цэнтра беларускай культуры “Радзіма” горада Таліна “Пяюць паэты на зямлі…” да 90-годдзя Еўдакіі Лось падзякі атрымалі Караліна Казачонак і Марына Чарнова, дыплом за III месца — Надзея Чарнова.

Паводле даўняй традыцыі навучальны год у школе пачынаецца з першага званка. Гонар даць яго на гэты раз выпаў беларускаму консулу Галіне Найдзёнавай. Што, лічым, вельмі сімвалічна: гэта ж нібы сама Беларусь благаславіла нашу “Вясёлку”, яе вучняў і настаўнікаў у добры шлях у Краіну ведаў.

**Людміла Сінякова,**
куратар школы, сябар праўлення
суполкі “Уздым”, сябар праўлення
Саюза беларусаў Латвіі.
Фота: **Мікола Паўловіч.**

**Ад рэдакцыі.** Дорым усім, хто спалучаны ніцінамі беларускіх лёсаў з нядзельнаю школай у Даўгаўпілсе, святочны вершык — у стылістыцы дзіцячага раншніка.

*Школцы-“Вясёлцы” цяпер — 25!*
*Рады са святам сяброў віншаваць!*
*Хай зіхацінь, ды на колеры ўсе*
*Школка-“Вясёлка” — у Даўгаўпілсе!*

Выстава беларускіх падручнікаў першай паловы XX стагоддзя


КАНТЭКСТ

# Добрасуседства як каштоўнасць

## Прэзідэнт Беларусі запрасіў Польшчу да дыялогу пра будучыню адносін. І беларусы з суседняй краіны шмат робяць у імя таго, каб зберагчы добрасуседства як галоўную каштоўнасць.

Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа павіншаваў Прэзідэнта Польшчы Анджэя Дуду й грамадзян суседняй краіны з Нацыянальным святам незалежнасці, якое адзначаецца 11 лістапада. “Беларусам і палякам лёсам наканавана жыць побач у міры ды згодзе. У сённяшніх няпростых абставінах неабходна зберагчы нашае добрасуседства як галоўную каштоўнасць, якую мы атрымалі ў спадчыну й павінны перадаць сваім нашчадкам”, — гаворыцца ў віншаванні. Запрашаючы Анджэя Дуду да канструктыўнага дыялогу пра будучыню беларуска-польскага супрацоўніцтва, Аляксандр Лукашэнка ўдакладніў: “Толькі працуючы разам, зможам захаваць мы прыкметныя дасягненні ў гандлі, прамысловай каапераціі, навуцы, адукацыі ды іншых сферах. Гэта адпавядае як нацыянальным інтарэсам абедзвюх дзяржаў, так і жаданням мільёнаў жыхароў нашых краін”.

Зазначым, што наладжванню добрасуседскіх дачыненняў з Польшчай даўно спрыяе й беларуская дыспара. Час ад часу мы друкуем падборкі навін з Польшчы на аснове паведамленняў з беларускай Амбасады. Згадаем хаця б сёлетнія “Варшава, Торунь, Гайнаўка...” (18.03.2020) пра яскравыя прыкметы беларускага жыцця ў розных месцах Польшчы, “На тым беразе Буга” (04.08.2020) — пра ўшанаванне памяці воінаў, якія загінулі ў баях за вызваленне Варшавы ды цікавыя імпрэзы ў гонар Дня Незалежнасці Беларусі. Нядаўна ж у рэдакцыю салідную падборку вестак пра шэраг тамтэйшых падзей (на падставе публікацый у Фэйсбуку) мы атрымалі з Культурнага цэнтра Беларусі ў Польшчы, іх даслала Ilona Yurevich — Radca Ambasady Bialorusi w Polsce, Dyrektor Centrum Kulturalnego. Спадзяемся, чытачам тут усё зразумела й без перакладу.

Спадарыня Ілона згадвае, што Беларускае грамадска-культурнае таварыства ў Польшчы (БГКТ) выпусціла ў красавіку ў свет чарговы “Беларускі Каляндар 2020” з фінансавай падтрымкай Беларускага культурнага цэнтра. У альманаху ёсць апаведы пра ўсе найцікавейшыя імпрэзы, якія зладзіла БГКТ у 2019 годзе, пра юбілеі творчых гуртоў, дзеячаў беларускай нацменшасці на Падляшшы. Надрукаваныя й новыя творы беларускіх пісьменнікаў, у тым ліку Віктара Шведа, Дзмітрыя Шатыловіча, Міры Лукшы, Юрыя Баены ды іншых.

А ў маі, хоць і напружваў каранавірус, але ж была праведзена 26-я Агульнапольская Алімпіяда па беларускай мове 2020 года, праўда, трошкі ў іншым фармаце. Па яе выніках фіналістамі сталі 25 ліцэістаў. Паколькі ж адменены сёлета быў апошні этап Алімпіяды, то ўсім фіналістам прызначаны статус і льготы лаўрэатаў! “Прызы Алімпіяды накіравалі фіналістам па пошце, — паведамляе Ілона Юрэвіч. — Амбасада й Культурны цэнтр Беларусі ў Польшчы традыцыйна далучыліся да галоўнага арганізатара (кафедры беларусістыкі Варшаўскага ўніверсітэта), падрыхтавалі свае падарункі й дыпломы. Дарэчы, са студэнтамі й выкладчыкамі гэтае кафедры 1 чэрвеня ў фармаце анлайн сустракаўся Амбасадар Беларусі ў Польшчы Уладзімір Чушаў. Гаварылі пра святкаванне 75-годдзя Вялікай Перамогі, унёсак беларускага народу ў яе дасягненне, пра ўшанаванне подзвігу, герояў векапомнай вайны ў нашым часе.

Мы пісалі, што 1 ліпеня, да Дня Незалежнасці ў Амбасадзе адкрылася фотавыстава “Мая Беларусь”: былі прадстаўлены аб’екты нацыянальнай гістарычна-культурнай спадчыны. І што ў ходзе ўрачыстасці з нагоды свята ганаровую грамату Мінадукацыі, падзяку Міністра інфармацыі Беларусі атрымала загадчыца секцыі беларусістыкі Універсітэта Беластока Галіна Тварановіч. А Яну Чыквіну, старшыні беларускага літаб’яднання “Белавежа”, уручана Ганаровая грамата Мінкультуры Беларусі. Абодва — вядомыя прадстаўнікі беларускай нацменшасці ў Польшчы. Паведамлялі таксама, што знакавую імпрэзу ў плыні святкавання Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь і 75-годдзя Вялікай Перамогі ў Другой сусветнай вайне Амбасада й Культурны цэнтр Беларусі ў Польшчы правялі ў Музеі Незалежнасці ў Варшаве, адным з галоўных музеяў Польшчы.




КУЛЬТУРНЫ ЦЭНТР БЕЛАРУСІ Ў ПОЛЬШЧЫ

**На Беларускім народным фэстыні ў Сямятычах**

У ліпені-кастрычніку ў розных мясцовасцях Падляшскага ваяводства БГКТ й мясцовыя асяродкі культуры пры падтрымцы мясцовых уладаў, Культурнага цэнтра Беларусі ў Польшчы (КЦБ) традыцыйна ўжо ладзілі шэраг беларускіх народных фэстынаў. Маркую, мілагучнае слоўца (згадаем фэст, фестываль) нікому слых не рэжа. “Фэстыны штогадова збіраюць знакамітыя калектывы з Беласточчыны й Беларусі, якія выконваюць беларускія музычныя творы, — удакладняе спадарыня Ілона. — З найбольш вядомых: “Куранты” й “Васілёчкі” з Бельска Падляшскага, “Рэха Пушчы” з Гайнаўкі, “Аморфас” з Сямятыч, “Шпількі” з Міхалова ды іншыя. Сёлета, на жаль, калектывы з Беларусі не маглі ўзяць удзел у фэстынах”.

А 9 жніўня ў амфітэатры пры Падляшскай оперы й філармоніі ў Беластоку прайшло 35-е ўжо Свята беларускай культуры. Штогод ладзіць такую імпрэзу для жыхароў Падляшша БГКТ, пасля з’яўлення Культурнага цэнтра Беларусі ў Польшчы (ліпень 2008) — пры ягонай падтрымцы. На гэты раз непаўторны фэст сабраў 16 творчых калектываў і выканаўцаў з Беластока, Гайнаўкі, Гарадка, Сямятычаў, Міхалова, Макаўкі, Машчоны Каралеўскай, Залук. Гучалі на фэсце беларускія песні, прадаваліся кнігі й сувеніры ад народных майстроў.

І яшчэ згадаем пра 10-гадовы юбілей аматарскага калектыву “Аморфас”: ён створаны пры гмінным асяродку культуры 10 гадоў таму па ініцыятыве старшыні Галоўнага праўлення БГКТ Яна Сычэўскага й дырэктара Сямятыцкага асяродка культуры Яланты Сідаровіч. 30 жніўня ў Сямятычах урачыста віншавалі юбіляраў. Рэпертуар гурта — разнастайны, але пераважаюць у ім беларускія песні, у тым ліку аўтарскія — мастацкай кіраўніцы Хэлены Шчыгол. “Аморфас”, паведамляе Ілона Юрэвіч, годна прадстаўляе беларускую песню як на Падляшшы і ў Польшчы, так і ў Беларусі: выступаў у часе вядомых фэстаў. За значны ўнёсак у развіццё беларуска-польскіх культурных сувязяў Культурны цэнтр Беларусі ў Польшчы адзначыў гурт “Аморфас” дыпломам.

Дзякуем за цікавыя паведамленні, шаноўная Ілона! Спадзяемся й на далейшую плённую супрацу на карысць беларуска-польскага добрасуседства, якое, сапраўды, ёсць велізарная каштоўнасць.

**Іван Ждановіч**

РОЗГАЛАС

# Бульба, што злучае лёсы

**У вячорак, якія зладзілі беларусы Нарвы, ёсць крэатыўны працяг**

**Ад рэдакцыі.** Пра Людмілу Стулаву (у дзявоцтве Жыліч) мы ўдакладнілі, што яна з Гомельшчыны, з Жыткавічаў: там нарадзілася й вырасла. Закончыла Віцебскі тэхнікум сувязі, па спецыяльнасці працавала. І, можна сказаць, дзякуючы бульбе знайшла лёс, выйшла замуж. У 1977-м у родным горадзе пазнаёмілася з хлопцам-матросам, які прыехаў у раён бульбу нарыхтоўваць для Паўночнага флота. Пэўна, даспадобы прыйшліся нарвіцяніну не толькі дранікі: у 1978-м звёз і Людмілу. А гатаваць, у тым ліку й дранікі, вучыла яе маці, Ніна Уладзіміраўна — ёй ужо 95, жыве ў Жыткавічах. І па гэты час, дарэчы, дранікі гатуе па самым простым рэцэпце. Яго цяпер ведае й Сцяпан — яе праўнук, унук Людмілы. А таксама й Марк, сын Вольгі Чупавай.

Памятаеце нашы бульбяныя вячоркі? (Гл.: “Смачнае свята ў Нарве”: ГР, 29.10.2020). Рады паведаміць: у іх ёсць крэатыўны працяг. На той імпрэзе была наша суплямянніца Вольга Чупава (https://www.facebook.com/olga.tsupova), галоўрэд нараўскага інфапартала Narvaleht (https://narvaleht.ee). Вольга й прапанавала гаспадыням з суполкі “Сябры” праводзіць майстар-класы: гатаваць нацыянальныя беларускія стравы. І вырашылі мы задумку ўвасобіць, запрашаючы дзяцей на дзэю. Вольга нам абяцае інфападтрымку. Так што — за справу!

Не сакрэт: у многіх з нашых суседзяў ды ўвогуле замежнікаў лічыцца: дранікі — галоўная беларуская страва. Стэрэатып, але стойкі! Так, гэта найвядомая ды найпапулярная страва беларускай кухні. Многія жыхары еўрапейскіх краін, дарэчы, лічаць дранікі сваімі, але ж куды ім да беларусаў! Дранікі ў нас — у сілу розных прычын — прыжыліся найлепш, сталі нацыянальным брэндам.



ВІКТАР БАЙКАЧОЎ

**Людміла Стулава дзеліцца майстэрствам**

8 лістапада Людміла Стулава, з актывістак суполкі “Сябры”, правяла першы майстар-клас. З ёю разам гатавалі дранікі Марк Пятроў (на здымку меншы) і Сцяпан Стулаў. Хоць усе заяўленыя дзеці не паўдзельнічалі, затое відэа пагляддзяць. І вам таго жадаем (відэа тут https://narvaleht.ee), ды — смачна есці!

**Віктар Байкачоў**, г. Нарва

“Голас Радзімы”: 65 гадоў!

Чытайце газету ў інтэрнэце на партале zviazda.by
Падпісацца на газету “Голас Радзімы” можна ў паштовых аддзяленнях Беларусі
© “Голас Радзімы”, 2020

**Заснавальнік:** Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова “Выдавецкі дом «Звязда»”
**Галоўны рэдактар** Іван ЖДАНОВІЧ
**Адрас рэдакцыі:** 220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а. Пакой 907.
**E-mail:** golas_radzimy@tut.by
**Тэлефон:** + 375-17-3111726
**Рэдакцыйнае пасведчанне №61.** Выдадзена 16.07.2018 года Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь
**Выдавец:** Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова “Выдавецкі дом «Звязда»”. Дырэктар – галоўны рэдактар Алесь Мікалаевіч КАРЛЮКЕВІЧ
**Аб’ём выдання:** 2 друк. арк.
**Падпісана да друку:** 27.11.2020 г.
**Наклад 371.**
**Заказ – 1633.**
Выходзіць 2 разы на месяц
**Месца друкавання:** Друкарня Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства “Выдавецтва «Беларускі Дом друку»” ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004 Пр-т Незалежнасці, 79/1. 220013, Мінск, Рэспубліка Беларусь
Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе, не вяртаюцца й не рэцэнзуюцца. Пазіцыі рэдакцыі ды аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках “Голасу Радзімы”, могуць не супадаць.